индивидуума, поэтому он возникает в определенном сознании не только лишь в виде намёка на возможные значения, но и служит отзывом на имеющийся языковой опыт человека из разнообразных сфер: поэзии, прозы, науки, социума, истории и т. д.

Языковое воплощение концепта «хитрость» в творчестве А. П. Сумарокова реализуется путём характеристики лица или предмета. Носители языка уделяют внимание тому, какие разновидности свойства «хитрость» могут быть присущи человеку. Научные работы Е. А. Скоробогатовой и Л. В. Савицкой, посвященные анализу специфики реализации указанного концепта, подтверждают то, что выражение обозначенного свойства показано через взаимодействие с другими людьми и определяется в использовании «косвенных, обманных путей, лукавства, скрытого умысла в действиях, занятия мошенничеством или в проявлении хитрости в выполнении определенных действий, умение находить выход из трудного положения, проявление изобретательности, умелости» [1, с. 23]. Хитрость проявляется в виде таких понятий, как сложность, нетипичность, хитроумие.

В результате исследования необходимо обозначить важные объекты сатиры А. П. Сумарокова: корыстолюбивые судьи, спесивые дворяне, невежественные помещики, богатые и нечестные купцы и торговцы, злые дворянские жёны, глупые и завистливые люди. В большинстве случаев различные аспекты анализируемого концепта «выражаются аллегорическими образами животных, совершающих те или иные действия, поступки: кошка, лисица и др.» [2, с. 37].

**Литература**

1 Скоробогатова, Е. А. Языковые средства реализации концепта «хитрость» в русской народной сказке / Е. А. Скоробогатова, Л. В. Савицкая. – Харьков : Светочь, 2006. – 356 с.

2 Русская басня: сборник / сост., вступ. ст. и примеч. Н. Л. Степанова. – Москва : Правда, 1986. – 540 с.

***К. В. Уніятава***
*Навук. кір.* ***А. А. Станкевіч****,*
*д-р філал. навук, прафесар*

## НАЗВЫ ЖАНОЧАГА СТРОЮ Ў ГАВОРКАХ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЁСКІ МАРКАВІЧЫ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА)

Беларускае народнае адзенне вызначаецца адметным нацыянальным каларытам. Як слушна адзначыў Міхась Раманюк, «асабліва высокага ўзлёту фантазіі і майстэрства мастацтва беларускае народнае адзенне дасягнула ў жаночым касцюме» [1, с. 5].

Назвы жаночага адзення ў гаворках Гомельшчыны даволі разнастайныя па спосабе ўтварэння і семантыцы. У тыповы комплекс жаночага адзення ўваходзілі *сарочка*, *спадніца* (або спадніца з нагруднікам, або *андарак*), *гарсэт – ушварка*, *фартух*, *хустка*.

Найважнейшай часткай адзення з’яўлялася *сарочка*, якую насілі ў будзённыя і святочныя дні ў любым узросце. Для сарочак нашай мясцовасці характэрны *полікавы крой* з *плечавымі ўстаўкамі*. *Полікавая кашуля* мела прамавугольныя або квадратныя ўстаўкі (*полікі, палікі*). Святочныя і паўсядзённыя сарочкі некалькі адрозніваліся кроем і аздабленнем. Сарочка, якую насілі ў будні, упрыгожвалася менш і шылася з больш грубага палатна. І святочная, і паўсядзённая сарочкі складаліся з дзвюх частак: верхняя шылася з больш якаснага палатна і багата ўпрыгожвалася, а ніжняя (*подтычка*) – з грубага абдзеркавага палатна – рэдка аздаблялася вышыўкай. Па меры зносу ніжняя частка замянялася на новую. Радзей шыліся суцэльныя сарочкі – вясельныя або святочныя сарочкі, якія адзяваліся пад *плахту* (*панёву*). З *палікамі* шылі сарочкі доўгія, з цэльнымі палотнішчамі тканіны, ці з *падточкай*. Каўнер-стойку ўпрыгожвалі сціплай вышыўкай. Дастаткова шырокі рукаў злучаўся з *палíком мярэжкай* з чырвоных, чорных, белых нітак. Рукаў унізе быў сабраны пад шырокі манжэт.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асноўныя месцы ўпрыгожвання сарочкі – рукавы з манжэтам і каўнер. Упрыгожванне – *вышыўка* і *мярэжка*. Раней быў пашыраны затыканы *бранай тэхнікай* рукаў. *Мярэжка* размяшчалася ў верхняй частцы рукава, па ёй рабілася вышыўка. Таксама аздабляліся стыкі плечавых уставак. Вялікае майстэрства ў выкананні ўзору жанчыны праяўлялі ў аздабленні вонкавай часткі рукава. Узор размяшчаўся ўверсе, таксама расшываўся ўвесь рукаў. Вышыўка ажыццяўлялася ў чырвона-чорнай гаме.

Манжэты аздабляліся вышыўкай, зборкай, карункамі, дэкаратыўнымі краявымі швамі (*абкіданне, зубленне*), вышыўкай на зборках. Каўнер-стойка небагата ўпрыгожваўся вышыўкай *крыжыкам*, вытыкаўся *бранай тэхнікай*. У некаторых сарочках сустракаецца вышыты папярочны або прадольны ўзор на ніжняй частцы. Калі падтыкаўся андарак або спадніца, быў бачны ўзор.

Пазней, у пачатку XX ст., сталі распаўсюджвацца сарочкі *паліковага крою* з шырокімі рукавамі, высокім каўняром-стойкай. У такіх сарочках адсутнічалі мярэжкі, месца злучэння паліка і рукава адзначалася вышытым узорам у выглядзе гірлянды з кветак, сцяблін і лісця. На асноўнай частцы рукава былі размешчаны вышытыя крыжыкам чырвонымі і чорнымі ніткамі букеты кветак, што і дало назву – *сарочкі кветкамі* або *кветкі*. Такія ўзоры аздаблялі і ўпрыгожвалі сарочку, надавалі ёй святочны і ўрачысты выгляд.

**Літаратура**

1 Раманюк, М. Ф. Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Выд.-ва “Беларусь”, 1981. – 317 с.

***А. Д. Цапалава***
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў «ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ» ІВАНА МЕЛЕЖА

Іван Мележ быў не першым, хто па-мастацку асэнсаваў праблемы зямлі, і працы на ёй. Але ён быў першым беларускім пісьменнікам, які даследаваў супярэчнасці калектывізацыі, паказаў яе вачамі людзей розных сацыяльных груп. Аб тым, што адбываецца ў эпоху калектывізацыі, аўтар мяркуе па свядомасці, па настроі палешукоў. Вылучае трылогію І. Мележа сярод іншых твораў з падобнай праблематыкай паказ калектывізацыі з пункту гледжання розных яе ўдзельнікаў.

У «Палескай хроніцы» можна вылучыць тры скразныя лініі. Адна з іх адлюстроўвае настроі і праблемы сялян. У творы прадстаўлены бясконцыя перажыванні і развагі сялян, іх недавер да таго, што маёмасць, якую яны аддадуць у калгас, будзе дагледжана належным чынам, і неразуменне, «з чаго мусіў той калгас так пабагацець, калі ўсе сыдуцца разам» [1, с. 81], і варожасць у адносінах да новага ладу кіравання.

Другая лінія – цяжкасці, з якімі сутыкнуліся прадстаўнікі мясцовай улады ў перыяд калектывізацыі. Паказаны праблемы пераадолення сялянскага недаверу, правядзення так званай асцярожнай, памяркоўнай калектывізацыі. Адзін з галоўных вобразаў тут – вобраз камуніста Івана Апейкі. «Адрозненне Апейкі ад астатніх “калектывізатараў” – уменне бачыць рэчы і з’явы ў іх сапраўдным святле, з пазіцый народна-гуманістычнай свядомасці» [2, с. 100]. Вобраз Башлыкова адлюстроўвае прамалінейнага кіраўніка, які пры выкананні задання партыі гатовы адразу прымусова загнаць сялян у калгас. Вобразы супрацьлеглыя. І. Мележ выкарыстаў такі мастацкі прыём, каб адлюстраваць тыпы прадстаўнікоў улады на месцах.

Трэцяя лінія, паказаная ў трэцяй частцы “Палескай хронікі”, – праблема кіравання калгасамі. Раман “Завеі, снежань” застаўся незавершаным, таму праблема недасканалага кіраўніцтва не была цалкам раскрытая.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ